ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 52 (1015) | Субота, 25 снежня 1954 года | Цана 50 кап.

У Камітэце па міжнародных Сталінскіх прэміях „За ўмацаванне міру паміж народамі"

11, 14 і 18 снежня ў Маскве пад старшынствам акадэміка Д. В. Скабельцына адбыліся пасяджэнні Камітэта па міжнародных Сталінскіх прэміях «За ўмацаванне міру паміж народамі».

Камітэт разгледзеў паступіўшыя прапановы аб прысуджэнні міжнародных Сталінскіх прэмій за гэты год і прыняў рашэнне па гэтаму пытанню.

Ніжэй публікуецца пастанова Камітэта аб прысуджэнні міжнародных Сталінскіх прэмій за 1954 год.

Аб прысуджэнні міжнародных Сталінскіх прэмій „За ўмацаванне міру паміж народамі" за 1954 год

Пастанова Камітэта па міжнародных Сталінскіх прэміях „За ўмацаванне міру паміж народамі" ад 18 снежня 1954 года

За выдатныя заслугі ў справе барацьбы за захаванне і ўмацаванне міру прысудзіць **міжнародныя Сталінскія прэміі «За ўмацаванне міру паміж народамі»** наступным асобам:

Дэнісу Ноэлю **Прыту** — юрысту (Англія),

Алену **Ле Леапу** — генеральнаму сакратару Усеагульнай канфедэрацыі працы (Францыя),

Такіну Кодо **Хмаінгу** — пісьменніку (Бірма),

Бертольду **Брэхту** — паэту і драматургу (Германія),

Феліксу **Іверсену** — прафесару універсітэта ў г. Хельсінкі (Фінляндыя),

Андрэ **Бонару** — прафесару Лазанскага універсітэта (Швейцарыя),

Бальдомеро **Санін Кано** — прафесару, ганараваму доктару Эдзінбургскага і Богацінскага універсітэтаў (Калумбія).

Прыйоно — прафесару, дэкану літаратурнага факультэта Дзяржаўнага універсітэта ў Джакарце (Інданезія),

Ніколасу **Гільену** — паэту (Куба).

Старшыня Камітэта Д. В. СКАБЕЛЬЦЫН.
Намеснікі старшыні Камітэта ГО МО-ЖО (Кітай),
ЛУІ АРАГОН (Францыя).

Члены Камітэта:

Анна Зегерс (Германія), **Антоніо Банфі** (Італія), **Джон Бернал** (Англія), **Ян Дэмбоўскі** (Польшча), **Пабло Неруда** (Чылі), **Міхаіл Садавяну** (Румынія), **Сахіб Сінг Сакхей** (Індыя), **Г. В. Александраў** (СССР), **А. А. Фадзееў** (СССР), **І. Г. Эрэнбург** (СССР).

18 снежня 1954 года
г. Масква.

75-годдзе з дня нараджэння І. В. Сталіна

На ўсіх прадпрыемствах, ва ўстановах, у калгасах, соўгасах і МТС рэспублікі праводзяцца гутаркі, даклады і лекцыі аб жыцці і дзейнасці вернага вучня і саратніка В. І. Леніна — Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

Гутаркі аб 75-годдзі з дня нараджэння І. В. Сталіна адбыліся на заводзе імя Кірава, аўтамабільным і трактарным заводах і іншых прадпрыемствах сталіцы.

Члены агітклектыву пры партарганізацыях калгасаў імя Леніна, «Чырвоны Кастрычнік», імя Варашылава Церахоўскага раёна Гомельскай вобласці правялі гутаркі на тэмы: «Жыццё і дзейнасць І. В. Сталіна», «І. В. Сталін — вялікі прадаўжальнік справы Леніна». З вялікай увагай слухалі калгаснікі сельгасарцелі «Большэвік» Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці гутарку на тэму «І. В. Сталін — верны вучань і прадаўжальнік вялікай справы В. І. Леніна».

У дзяржаўнай бібліятэцы імя В. І. Леніна ў Мінску арганізавана выстаўка літаратуры, прысвечаная 75-годдзю з дня нараджэння І. В. Сталіна. На выстаўцы прадстаўлены творы вернага вучня і саратніка Леніна — І. В. Сталіна, якія выдадзены на рускай і беларускай мовах. Тут-жа экспануюцца творы І. В. Сталіна, якія перакладзены на мовы народаў Совецкага Саюза і на многія замежныя мовы.

У бібліятэках Церахоўскага, Рэчыцкага, Добрушскага і іншых раёнаў арганізаваны выстаўкі твораў І. В. Сталіна, фотамантажы, якія расказваюць аб вопыце сацыялістычнага будаўніцтва ў Совецкім Саюзе і ў краінах народнай дэмакратыі.

* * *

Кожная бібліятэка, клуб, хата-чытальня штогод падпісваюцца на новыя выданні твораў вернага вучня В. І. Леніна—І. В. Сталіна. У студэнцкім інтэрнаце, у рабочага, пісьменніка, мастака, нават на кніжнай паліцы старшакласніка абавязкова ўбачыш гэтыя заўсёды патрэбныя неўміручыя творы.

У Дзяржаўным выдавецтве БССР выдадзена за пасляваенныя гады каля трохсот кніг і брашур І. В. Сталіна, тыраж якіх даходзіць да сямі мільёнаў. Акрамя таго, на працягу 1947—51 гг. быў выдадзены Збор яго твораў у трынаццаці тамах. Другое выданне пачалося ў 1954 годзе, і падпісчыкі ўжо атрымалі першыя восем тамоў. Толькі за гэты год выдадзена больш дзесяці асобных работ І. В. Сталіна. Сярод іх: «Пытанні Кітайскай рэволюцыі» (прамова ў Кітайскай камісіі ВКП(б) 30 лістапада 1926 года), «Пытанні ленінізма» ў восьмым выданні, «Ленін, як арганізатар і правадыр РКП», «Супраць апашлення лозунга самакрытыкі», «Як разумее социял-дэмакратыя нацыянальнае пытанне», «Да пытання аб стратэгіі і тактыцы рускіх комуністаў» і многа іншых.

УКАЗ
ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Аб правядзенні выбараў у Вярхоўны Совет Беларускай ССР і ў абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных Беларускай ССР

У сувязі з заканчэннем 25 лютага 1955 года поўнамоцтваў Вярхоўнага Совета Беларускай ССР трэцяга склікання і 22 лютага 1955 года — поўнамоцтваў абласных, раённых, гарадскіх, сельскіх і пасялковых Советаў дэпутатаў працоўных Беларускай ССР чацвёртага склікання Прэзідыум Вярхоўнага Совета Беларускай Совецкай Социялістычнай Рэспублікі **пастанаўляе:**

Назначыць выбары ў Вярхоўны Совет Беларускай ССР і ў абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных Беларускай ССР на нядзелю 27 лютага 1955 года.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР В. КАЗЛОЎ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Д. ЛУКАШЭВІЧ.

20 снежня 1954 года
гор. Мінск.

Сталін у Курэйцы

Скаваў мароз прасторы Енісея.
Заінела суровая тайга.
За вокнамі мяцель сняжынкі сее,
Даль закрывае белая смуга.

Мароз узор выводзіць маляўнічы
На сінім шкле, падобна мастаку.
Гараць у печы дровы. Паляўнічы
Маўкліва люльку курыць у кутку.

Запаўшыя маршчыністыя шчокі,
Відаць, не лёгка ён пражыў свой век.
Даўно запоўнілі хаціну змрокі.
А Коба піша. Мудры чалавек!

Усё ён ведае — як ходзяць рэкі,
Як можна сад на поўначы садзіць,
Параіў ад хвароб нязлечных лекі
І расказаў, як трэба хлеб расціць.

За вокнамі завеі калыханка...
Сядзіць ён перад лямпай за сталом,
Поўночная Курэйка... Туруханка...
А твар яго азораны святлом.

— Ну, як здабыча? — запытаў старога,
І паказаўся з цемры твар худы:
— Закрыта у тайгу цяпер дарога,
І замяла мяцель усе сляды.

У кожнай хаце гаспадарыць голад,
Кавалка хлеба для дзяцей няма.
А тут яшчэ такі страшэнны холад,
Бязлітасная, доўгая зіма....

А Коба кажа: — Хутка дзень настане,
Свае цяжкія путы скінем мы.
І разаб'е народнае паўстанне
І царскі трон, і мёртвы лёд зімы.

Мы жыватворчыя разбудзім рэкі,
Каб імі напаіць бязводны стэп.
І ў нашы пуставаўшыя засекі
Засыплем намі вырашчаны хлеб.

Задумаўся стары ў глыбокай цішы,
Распальваючы люльку вугалём.
А над тайгою ноч, і Коба піша.
І твар яго азораны святлом.

Усход ад ранішняй зары святлее,
Радзее ночы белая смуга.
Халодны лёд трашчыць на Енісеі,
І множыць рэхам гэты гул тайга.

Свае аковы снежныя ўзрывае
Рака, узбунтаваная да дна.
І чутны у паветры подых мая,
Вялікага Кастрычніка вясна.

Сцяпан ГАЎРУСЕЎ

Лекцыі і гутаркі

Калектыў Белдрэса носіць імя І. В. Сталіна. Да 75-годдзя з дня нараджэння Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна калектыў станцыі датэрмінова завяршыў гадавое заданне па выпрацоўцы электраэнергіі і зэканоміў два з паловаю мільёны рублёў.

У Палацы культуры энергетыкаў адкрыта вялікая выстаўка твораў І. В. Сталіна. Рабочыя і служачыя станцыі праслухалі гутаркі аб жыццёвым шляху І. В. Сталіна.

* * *

Увагу наведвальнікаў бібліятэкі Брэсцкага гаркома партыі прыцягвае арганізаваная тут кніжная выстаўка, прысвечаная жыццю і дзейнасці І. В. Сталіна. Такія-ж выстаўкі адкрыты ў чытальнай зале і аддзеле хатняга абанементу абласной бібліятэкі.

Гутаркі і даклады аб І. В. Сталіне праведзены ў цэхах паравознага дэпо Брэст-Цэнтральны, у педагагічным інстытуце імя А. С. Пушкіна, педагагічным вучылішчы, у аўтатранспартнай канторы, школах горада і іншых прадпрыемствах і ўстановах Брэста.

* * *

Падоўгу спыняюцца чытачы Гомельскай абласной бібліятэкі каля фотаплаката, які расказвае аб жыцці і дзейнасці В. І. Леніна і І. В. Сталіна. У чытальнай зале і дзіцячай бібліятэцы да 75-годдзя з дня нараджэння І. В. Сталіна арганізаваны вялікія кніжныя выстаўкі.

У цэхах завода «Гомсельмаш», тлушчакамбіната, на заводзе імя Кірава і іншых прадпрыемствах Гомеля агітатары правялі гутаркі аб жыцці і дзейнасці І. В. Сталіна. У бібліятэцы завода «Гомсельмаш» зроблен цікавы альбом з фотаздымкамі, якія расказваюць аб жыцці і дзейнасці І. В. Сталіна.

Гутаркі на тэмы: «І. В. Сталін — вучань і бліжэйшы саратнік В. І. Леніна», «Ленін і Сталін — арганізатары Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі» праведзены ў цэхах Рэчыцкага мэблевага камбіната, у калгасах імя Дзержынскага і «Совецкая Беларусь», у педвучылішчы і землеўпарадкавальным тэхнікуме.

Другі Усесаюзны з'езд совецкіх пісьменнікаў

16 снежня на ранішнім пасяджэнні былі заслуханы садаклады **Б. Н. Палевога** «Совецкая літаратура для дзяцей і юнацтва» і **Самеда Вургуна** «Совецкая паэзія».

На вячэрнім пасяджэнні з дакладам Мандатнай Камісіі выступіў пісьменнік **Л. Нікулін.** Паведаміўшы, што на з'езд выбрана 738 дэлегатаў, з іх 626 з правам рашаючага і 112 з правам дарадчага голасу, ён коратка спыніўся на зменах, якія адбыліся ў складзе Саюза совецкіх пісьменнікаў СССР пасля Першага з'езду. У 1934 годзе Саюз налічваў 1.500 членаў і кандыдатаў, на 1 снежня 1954 года — 3.695. Рост колькаснага складу больш чым у 2,5 раза сведчыць таксама аб вялікіх якасных зменах у складзе Саюза. На з'ездзе прысутнічаюць пісьменнікі 45 нацыянальнасцей, якія прадстаўляюць розныя пакаленні совецкіх літаратараў.

Затым з'езд заслухаў садаклад **К. М. Сіманава** «Праблемы развіцця прозы».

На ранішнім пасяджэнні 17 снежня пачалося абмеркаванне даклада А. А. Суркова і садакладаў Б. Н. Палевога, Самеда Вургуна і К. М. Сіманава.

Першае слова атрымаў латышскі пісьменнік **Віліс Лаціс.** Ён гаварыў аб тым, што совецкім пісьменнікам ёсць на што аглянуцца, ёсць што паказаць усяму свету. Менш чым за 40 год вырасла магутная, разумная, бясконца рознастайная совецкая літаратура — вялікая літаратура краіны перамогшага социялізма.

Гаворачы аб неабходнасці больш упартай барацьбы совецкай літаратуры з перажыткамі капіталізма ў свядомасці людзей, В. Лаціс падкрэсліў, што перш за ўсё неабходна пакончыць з гэтымі перажыткамі ва ўласным асяроддзі пісьменнікаў.

Пісьменнік **Л. Касіль** прысвяціў сваё выступленне літаратуры для дзяцей і юнацтва. Ён адзначыў, што ў нас мала працуюць з моладдзю. У жыцці кожнага сталага пісьменніка наступае такі час, калі павінна ўзнікнуць натуральная патрэбнасць работы з маладымі, цяга да рэдактарскай работы, накшталт таго, як звычайна ў майстра-акцёра з'яўляецца жаданне стаць рэжысёрам.

Важныя творчыя пытанні ўзняў у сваім выступленні **Якуб Колас.**

Хвалюючай была сустрэча дэлегатаў з'езду з юнымі піонерамі. Са з'ездаўскай трыбуны піонеры пажадалі пісьменнікам новых поспехаў, перадалі ім вялікую падзяку за любімыя кнігі. Дзеці прасілі пісаць для іх больш і лепш, а галоўнае, не сумна, аб сапраўдным жыцці, аб будоўлях і падарожжах.

Сібірскі пісьменнік **Г. Маркаў** напомніў заўвагу Горкага аб тым, што новая социялістычная літаратура павінна зрабіць полем свайго назірання ўсю нашу краіну. Прамоўца выказаў крытычныя заўвагі ў адрас дакладчыка і садакладчыкаў, якія вельмі мала закранулі пытанне работы пісьменнікаў у абласцях і краях.

Дэлегаты і госці з'езду горача сустрэлі кітайскага пісьменніка **Чжоу Яна,** які сардэчна вітаў совецкіх літаратараў ад імя мільёнаў чытачоў народнага Кітая. Кітайскі народ, сказаў ён, бачыць у совецкай літаратуры магутную зброю, якая дапамагае яму ў руху па шляху да социялізма. За пяць год на кітайскую мову перакладзена больш 600 твораў совецкіх пісьменнікаў.

Ад імя кітайскіх працоўных Чжоу Ян перадаў з'езду падарунак — дзве па-майстэрску зробленыя вазы.

М. Бажан ахарактарызаваў шлях развіцця украінскай совецкай літаратуры ў перыяд паміж двума з'ездамі, гаварыў аб яе непарыўнай сувязі з усёй совецкай шматнацыянальнай літаратурай і, перш за ўсё, з літаратурай рускага народа.

В. Лугаўской у сваім выступленні падкрэсліў шырокі тэматычны далягляд совецкай паэзіі, якая адгукаецца і на так званыя вечныя тэмы і на надзённыя пытанні сучаснасці. Прамоўца гаварыў аб неабходнасці па-горкаўску ўважліва і клапатліва ставіцца да маладых паэтаў, аб канкрэтнай дапамозе **ім.**

Каві Наджмі расказаў аб тым, як у дружнай сям'і брацкіх літаратур расце і развіваецца літаратура Совецкай Татарыі. Ён прыводзіць выказванні чытачоў, якія патрабуюць ад пісьменнікаў больш змястоўнага і яркага паказу жыцця совецкіх людзей.

У нашай паэзіі нямала недахопаў, але поспехі яе бясспрэчныя, сказаў **С. Шчыпачоў.** Прамоўца ставіць пытанне аб яшчэ большым набліжэнні літаратуры да чытача, аб выпуску масавай кнігі — выданні вялікімі тыражамі невялікіх па фармату кніжак, аб пашырэнні сеткі кніжных магазінаў і кіёскаў.

На вячэрнім пасяджэнні 17 снежня выступіў старэйшы літоўскі пісьменнік **А. Вієнуоліс.** Ён гаварыў аб тым, што старэйшае пакаленне павінна перадаць пачынаючым пісьменнікам свой багацейшы вопыт вывучэння жыцця.

Развіццю сучаснай азербайджанскай літаратуры прысвяціў сваё выступленне **С. Рагімаў.**

— Наша літаратура, — сказаў **Ільля Эрэнбург,** — садзейнічае духоўнаму росту совецкага народа, і ўсе совецкія пісьменнікі могуць з законнай гордасцю падумаць аб пройдзеным шляху.—Прамоўца падкрэсліў, што наша літаратура павінна быць праўдзівай, а некаторыя аўтары, прыхарошваючы сваіх герояў, духоўна іх збядняюць.

О. Ганчар значнае месца ў сваім выступленні аддаў пытанням далейшага развіцця брацкіх нацыянальных літаратур і іх творчых узаемасувязей. Выказаўшы задавальненне рашэннем аб ператварэнні альманаха «Дружба народаў» у штомесячны часопіс, прамоўца прапанаваў стварыць усесаюзнае выдавецтва нацыянальных літаратур.

М. Ісакоўскі падкрэсліў у сваёй прамове, што самай пільнай увагі заслугоўваюць песенныя вершы. Адзначыўшы дасягненні ў галіне песеннай творчасці, паэт указвае на адставанне гэтага жанра за апошнія два-тры гады.

С. Маршак выказаў крытычныя заўвагі адносна сістэмы планавання выдавецтвамі выпуску новых твораў дзіцячых пісьменнікаў. Неабходна прыцягваць новых людзей да стварэння дзіцячых кніг — людзей навукі, тэхнікі, мастацтва. Неабходна падумаць аб перавыданні некаторых каштоўных кніг для дзяцей, якія цяпер незаслужана забыты.

На вячэрнім пасяджэнні выступілі **І. Абашыдзе, В. Катаеў, С. Улуг-Задэ.**

На ранішнім пасяджэнні 18 снежня першым выступіў **В. Каверын.** Ён гаварыў аб значэнні працы пісьменніка, аб пастаянным павышэнні прафесійнага майстэрства.

Старшыня Саюза польскіх пісьменнікаў лаўрэат Міжнароднай Сталінскай прэміі «За ўмацаванне міру паміж народамі» **Леон Кручкоўскі** перадаў з'езду гарачае прывітанне ад імя польскіх пісьменнікаў.

З прамовамі выступілі таксама **П. Броўка** і **А. Пракоф'еў.** Садаклад «Совецкая драматургія» зрабіў **А. Е. Карнейчук.**

На вячэрнім пасяджэнні з'езд заслухаў садаклад **С. А. Герасімава** «Совецкая кінадраматургія».

Старэйшы совецкі пісьменнік **Ф. Гладкоў** падкрэсліў у сваім выступленні, што Саюз пісьменнікаў павінен быць творчай, а не адміністрацыйнай арганізацыяй, школай для літаратурнай моладзі.

Народны артыст СССР **Н. Чэркасаў** гаварыў аб вялікім даўгу совецкіх пісьменнікаў перад мастацтвам тэатра і кіно.

Н. Рыбак прысвяціў сваё выступленне пытанням совецкага гістарычнага рамана.

Цёпла сустрэлі прысутныя выступленне вядомай нямецкай пісьменніцы **Анны Зегерс,** прысвечанае вялікай ролі совецкай літаратуры ў жыцці і барацьбе народа ГДР.

19 снежня на ранішнім пасяджэнні першым выступіў мардоўскі пісьменнік **Н. Эркай.** Ён расказаў аб поспехах свайго народа ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве.

Армянскі пісьменнік **Наіры Зар'ян** гаварыў аб адзінстве шматнацыянальнай совецкай літаратуры, аб найвялікшай ролі рускай мовы, дзякуючы якой лепшыя творы брацкіх літаратур сталі здабыткам шырокіх мас чытачоў усяго Совецкага Саюза і іншых краін.

С. Міхалкоў напомніў аб адказнасці драматургаў, якія пішуць для дзіцячага тэатра, аб неабходнасці пашырэння сеткі дзіцячых тэатраў.

Большую частку прамовы С. Міхалкоў прысвяціў пытанням развіцця совецкай камедыі і сатыры.

З прывітаннем з'езду выступіў сакратар ЦК ВЛКСМ тав. **А. Рапохін.**

В'етнамскі пісьменнік **Нгуэн Дзен Тхі** перадаў сардэчнае прывітанне з'езду ад работнікаў літаратуры і мастацтва В'етнама.

Вострыя крытычныя заўвагі былі ў выступленні **В. Овечкіна.** У прыватнасці, ён спыніўся на існаваўшай сістэме прэміравання твораў літаратуры.

Садаклад «Мастацкія пераклады літаратур народаў СССР», падрыхтаваны П. Антакольскім, М. Ауэзавым і М. Рыльскім, зрабіў **П. Антакольскі.**

Адным з праяўленняў дружбы паміж нашымі народамі з'яўляюцца ўзаемныя пераклады брацкіх літаратур.

Асаблівае значэнне мае пераклад твораў брацкіх літаратур на рускую мову.

Дакладчык адзначыў, што яшчэ дрэнна абстаіць справа са стварэннем тэорыі перакладу, расказаў аб дзейнасці А. М. Горкага, а таксама Валерыя Брусава, якія многа зрабілі для азнаямлення рускага чытача з творамі брацкіх літаратур.

На жаль, сказаў Антакольскі, побач з добрымі работамі яшчэ з'яўляецца немалая колькасць работ шэрых, рамесніцкіх, дзе перададзен змест арыгінала, але страчана яго прывабнасць. Адчуваецца недахоп перакладчыцкіх кадраў. Міністэрства культуры СССР павінна, нарэшце, перагледзець навучальныя праграмы гуманітарных ВНУ і ўключыць у іх абавязковае вывучэнне моваў народаў СССР, а таксама стварыць спецыяльныя семінары для студэнтаў, якія выявілі здольнасці да мастацкага перакладу. У літаратурным інстытуце імя Горкага неабходна стварыць факультэт і кафедру мастацкага перакладу.

Ранішняе пасяджэнне 20 снежня адкрылася выступленнем Міністра асветы РСФСР **І. Каірава,** які спыніўся на пытаннях дзіцячай літаратуры.

А. Кахар крытыкаваў дакладчыка і садакладчыкаў за тое, што яны не далі глыбокага аналізу асобных брацкіх літаратур.

Стоячы, бурнымі авацыямі пісьменнікі сустракаюць дэлегацыю воінаў Совецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Ад імя воінаў з'езд прывітаў Герой Совецкага Саюза гвардыі падпалкоўнік **А. А. Васільеў.** Са словам у адказ выступіў **Барыс Палевой.**

Б. Агапаў гаварыў аб значэнні нарыса як баявога жанра совецкай літаратуры.

М. Алігер падкрэсліла неабходнасць узняць літаратурную крытыку да ўзроўню задач, якія стаяць перад совецкай літаратурай.

Вітаючы з'езд, індыйскія пісьменнікі **Алі Сардар Джафры** і **Ахмед Абас** перадаюць падарункі — зборнік вершаў паэта Фаіс Ахмед Фаіза і вышыўку, прысланую ў дар совецкім пісьменнікам жанчынай з правінцыі Пенджабі.

Курбан Сахатаў (Туркменія) гаварыў аб росквіце нацыянальных совецкіх літаратур.

Растоўскі пісьменнік **М. Саналоў** крытыкаваў дзейнасць органаў ССП СССР.

Мірза Ібрагімаў выказаў думку, што трэба больш выдаваць навуковых прац па важнейшых праблемах літаратуры.

На вячэрнім пасяджэнні 20 снежня з садакладам аб асноўных праблемах совецкай літаратурнай крытыкі выступіў **Б. Рурыкаў.**

На з'ездзе прагучала запісаная на плёнку прамова **Поля Робсана,** якому амерыканскія ўлады адмовілі ў візе на выезд з ЗША.

Г. Мустафін расказаў аб поспехах казахскай совецкай літаратуры.

Французская пісьменніца **Эльза Трыале** гаварыла аб вялікай ролі, якую адыгрывае для чытачоў Захаду совецкая літаратура.

Кінарэжысёр **А. Даўнзнка** прысвяціў сваю прамову пытанням кінадраматургіі.

На ранішнім пасяджэнні 21 снежня з прывітаннем з'езду ад совецкіх профсаюзаў выступіла сакратар ВЦСПС тав. **П. Н. Корабава.**

Ад імя Саюза пісьменнікаў Чэхаславакіі з'езд вітаў **Ян Дрда.** Вядомая чэшская пісьменніца **Марыя Майерава** паднесла ў падарунак з'езду вялікую крыштальную вазу, выкананую чэшскімі майстрамі.

Удзельнікаў з'езду вітаў таксама прагрэсіўны галандскі пісьменнік **Тэй дэ Фрыз.**

На ранішнім пасяджэнні выступілі **А. Яшын,** эстонскі пісьменнік **Л. Рэмельгэст, А. Талькір** (Чувашская АССР), кіргізскі паэт **К. Малікаў, О. Берггольц,** украінскі пісьменнік **П. Казланюк,** башкірскі пісьменнік **М. Карым, С. Кірсанаў, П. Ругоеў** (Карэла-Фінская ССР).

На вячэрнім пасяджэнні 21 снежня выступіў **Е. Папоўкін,** які спыніўся на рабоце рускіх пісьменнікаў, што жывуць у нацыянальных рэспубліках і абласцях.

К. Чукоўскі прысвяціў сваю прамову праблемам мовы совецкіх літаратуразнаўчых кніг.

Затым выступіў Міністр культуры СССР **Г. Ф. Александраў.**

М. Шолахаў гаварыў аб вялікай адказнасці совецкага пісьменніка перад сваім народам.

Са словамі сяброўскага прывітання да дэлегатаў з'езду звярнуўся румынскі паэт **Міхай Бенюк.**

На вячэрнім пасяджэнні выступілі таксама **А. Венцлова,** акадэмік **В. В. Вінаградаў, Г. Нікалаева.**

22 снежня на ранішнім пасяджэнні першым выступіў прафесар **Д. Благой,** які закрануў некаторыя пытанні крытыкі і літаратуразнаўства.

Аб неабходнасці больш глыбокага вывучэння традыцый і стылю такіх пісьменнікаў, як Серафімовіч, Фурманаў, Н. Остроўскі, Макарэнка, гаварыла ў сваім выступленні пісьменніца **А. Караваева.**

З прывітаннем з'езду ў вершах выступіў народны паэт Туркменіі **Ата Саліх.**

Азербайджанскі пісьменнік **Н. Гусейн** прысвяціў сваю прамову значэнню вялікіх традыцый рускай совецкай літаратуры для развіцця літаратур народаў СССР.

Начальнік Галоўнага ўпраўлення працоўных рэзерваў **Г. І. Зеленко** ў сваёй прамове заклікаў пісьменнікаў пісаць больш твораў аб людзях працы, аб маладых рабочых, рамесніках.

З'езд віталі вучні працоўных рэзерваў.

На ранішнім пасяджэнні выступілі **В. Сабко, М. Турсун-Задэ.**

Ад пісьменнікаў сваіх краін прывітанні з'езду перадалі **Эрнст Фішэр** (Аўстрыя) і **Оскар Парланд** (Фінляндыя).

На вячэрнім пасяджэнні з дакладам «Сучасная прагрэсіўная літаратура свету» выступіў **Н. С. Тіханаў.** Дакладчык гаварыў аб велізарнай ролі прагрэсіўнай літаратуры ў жыцці народаў, аб яе ўдзеле ў барацьбе за мір, за лепшую будучыню народаў. Ён адзначыў, што ў краінах народнай дэмакратыі вырас вялікі і рознастайны атрад перадавых пісьменнікаў, ахарактарызаваў вынікі творчай дзейнасці прагрэсіўных пісьменнікаў капіталістычных краін.

На ранішнім пасяджэнні 23 снежня прадаўжалася абмеркаванне даклада і садакладаў.

В. Кочатаў (Ленінград) сказаў, што багацце духоўнага свету совецкага чалавека адкрывае перад пісьменнікам такія творчыя магчымасці, аб якіх нашы класікі не маглі і марыць. Між тым, некаторыя пісьменнікі праходзяць міма таго новага, што народжана совецкай рэчаіснасцю.

Дагестанскі паэт **Р. Гамзатаў** падкрэсліў у сваім выступленні неабходнасць больш цеснай сувязі паэзіі з народам, з тым, каб яна паўней і больш праўдзіва адлюстроўвала яго запаветныя думы і пачуцці.

На ранішнім пасяджэнні выступілі **Марыэта Шагінян, Н. Балдано, Л. Собалеў, В. Ермілаў.**

З паведамленнем камісіі праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў аб зменах у статуце Саюза совецкіх пісьменнікаў выступіў **Л. Леонаў.**

Са словамі прывітання да ўдзельнікаў з'езду звярнуліся **Петэр Верш** (Венгрыя), **Хрысто Радзеўскі** (Балгарыя), **Джэк Ліндсей** (Англія) і **Лі Гі Ен** (Карэйская Народна-Дэмакратычная Рэспубліка).

З'езд прадаўжае работу.

ДРУГІ ЎСЕСАЮЗНЫ З'ЕЗД СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

Праблемы развіцця прозы

★

Садаклад К. М. СІМАНАВА

★

Ва ўступнай частцы садаклада К. М. Сіманава дадзена характарыстыка трох асноўных перыядаў развіцця совецкай прозы за дваццаць год: часу да Вялікай Айчыннай вайны, гераічных ваенных год і пасляваеннага дзесяцігоддзя. Дакладчык адзначае характэрныя рысы развіцця совецкай літаратуры паміж з'ездамі: з'яўленне новых імён у літаратуры, шырокі выхад на ўсесаюзную арэну твораў брацкіх літаратур у перакладзе на рускую мову, рост колькасці кніг, створаных пісьменнікамі, што жывуць на перыферыі.

Назваўшы выдатныя кнігі, якія ўзбагацілі за гэтыя гады совецкую літаратуру, прааналізаваўшы тэмы, якія прыцягвалі ўвагу пісьменнікаў за гэты час, дакладчык сказаў, што зроблена нямала, і, аднак, мы нагадвалі-б тых вучоных, якія спрабавалі развіваць навуку «ў затхлай атмасферы ўзаемнага захвальвання і замоўчвання памылак», аб якіх гаварыў Г. М. Маленкоў на XIX з'ездзе партыі, калі-б спачылі на лаўрах і задаволіліся дасягнутым.

Значная частка садаклада прысвечана пытанням сутнасці метаду сацыялістычнага рэалізма і многастайнасці стыляў і творчых плыняў совецкай літаратуры.

Сацыялістычны рэалізм, як метад, сцвярджаўся ў жорсткіх умовах класавай барацьбы, у складаных абставінах будаўніцтва комунізма ў адной краіне і даказаў сваю боездольнасць у гады ўзброенай барацьбы з фашызмам.

Цяпер, у пасляваенныя гады, калі на шлях будаўніцтва сацыялізма стала 900 мільёнаў людзей, сацыялістычны рэалізм развіваецца як асноўны метад літаратуры ўсюды, дзе народ перамог; метад сацыялістычнага рэалізма на нашых вачах нараджаецца і ў мастацтве раду капіталістычных краін—там, дзе шырокія пласты працоўных, бачачы поспехі лагеру сацыялізма, вераць у перспектыву перамогі сацыялістычных ідэй ва ўласнай краіне і дзе ёсць мастакі, якія адлюстроўваюць гэты пункт гледжання простых людзей сваёй краіны і імкнуцца ствараць свае творы для гэтых простых людзей.

У літаратуры сацыялістычнага рэалізма, гаворыць далей К. М. Сіманаў, таксама як і ў кожнай літаратуры, паказаныя ў ёй людзі спрачаюцца, робяць памылкі, праступкі і нават злачынствы, аднак, не закрываючы вачэй на гэта, літаратура сацыялістычнага рэалізма выносіць над усім гэтым свой не двухсэнсоўны прысуд, справядлівы з пункту гледжання вялікіх інтарэсаў народа.

У якасці прыкладу, калі пісьменнік выносіць прысуд свайму герою не з пункту гледжання інтарэсаў народа, а насуперак ім, дакладчык называе аповесць Э. Казакевіча «Двое ў стэпе», якая азначала для пісьменніка ў той час адыход ад метаду сацыялістычнага рэалізма.

Эстэтыка літаратуры сацыялістычнага рэалізма ніколі не патрабавала ад мастака замоўчвання або абыходу цяжкасцей, звязаных з барацьбой людзей за будучыню.

Сацыялістычнаму рэалізму, з яго яснымі адносінамі да жыцця, з яго ацэнкай людскіх учынкаў з вышыні народных інтарэсаў, таксама варожа спакуса глядзець на рэчаіснасць праз ружовыя акуляры, як варожа любаванне змрокам і пакутамі.

Далей дакладчык спыняецца на няправільным разуменні некаторымі тэарэтыкамі сутнасці сацыялістычнага рэалізма, якія, падыходзячы дагматычна да выказванняў Максіма Горкага па гэтаму пытанню, сцвярджалі, што сацыялістычны рэалізм, у процілегласць старому рэалізму, з'яўляецца рэалізмам **толькі** сцвярджаючым, у той час як стары рэалізм быў **толькі** крытычным.

Дакладчык рашуча крытыкуе вульгарызатарскія разуменні некаторых тэарэтыкаў, якія спрабавалі даводзіць, што метад сацыялістычнага рэалізма вызначае і сам стыль, што ён на практыцы і з'яўляецца стылем. Калі заразіцца пафасам гэтых вульгарызатарскіх разважанняў, прадаўжае ён, то можна, увайшоўшы ў азарт, закаціцца і да выпрацоўкі «адзіна правільнай» кампазіцыі або «адзіна прыймальнага» сюжэта, якія з жалезнай паслядоўнасцю павінны быць адзіна адпаведнымі адзіна вернаму метаду.

Падмена разумення «метад» разуменнем «стыль» на справе абмяжоўвае магчымасці літаратуры сацыялістычнага рэалізма, звужвае крытэрыі, дазваляе некаторым крытыкам на словах заклікаць да многастайнасці, а на справе спрабаваць абстрыгчы ўсе кнігі пад адзін грэбень або, правільней кажучы, — пад нулявую машынку.

Варта падмяніць разуменне метаду сацыялістычнага рэалізма разуменнем стылю, называючы гэта прама сваімі словамі або падразумяваючы такую падмену ў агульным ходзе разважання, як адразу стане немагчыма гаварыць **аб рознастайнасці** стыляў унутры сацыялістычнага рэалізма.

Назваўшы такія розныя творы розных аўтараў, напісаныя на аснове метаду сацыялістычнага рэалізма, але непадобныя адзін на другі па свайму стылю, як «Непакораныя» Б. Гарбатава, «У акопах Сталінграда» В. Некрасава, «Валакаламскае шасе» А. Бека, «Сцяганосцы» А. Ганчара, дакладчык прадаўжае:

Адзначаючы ўсю шкоднасць спроб прадставіць нашу літаратуру як літаратуру адзінага стылю, належыць, аднак, тут-жа сказаць, што само жывое жыццё літаратуры няменна разбурала, разбурае і будзе разбураць усе падобныя спробы. Кожная буйная творчая індывідуальнасць у літаратуры — гэта стыль.

Разам з тым, адзначаючы своеасаблівасць мастацкіх стыляў тых ці іншых пісьменнікаў або стылістычную своеасаблівасць асобных кніг, мы маем магчымасць наглядаць у працэсе развіцця літаратуры і стылістычную блізкасць адных мастакоў да другіх, іншы раз ва ўсёй творчасці, іншы раз у тых ці іншых творах.

Стылявыя прынцыпы не толькі адрозніваюць пісьменнікаў аднаго ад другога, але часта збліжаюць іх творчасць і ў свядомасці чытачоў і ў іх уласнай свядомасці.

К. М. Сіманаў спыняецца на пытанні аб праўдзівым адлюстраванні жыцця ў літаратуры. Гаворачы аб творах, у той ці іншай меры пабудаваных на пяску даволі прыблізнага ведання людзей, што малююцца ў творы, і аднабаковага меркавання пра іх, ён крытыкуе аповесць І. Эрэнбурга «Адліга».

У сваёй аповесці І. Эрэнбург закранае рад праблем, якія не можа абыходзіць літаратура, калі яна не жадае абыходзіць вострыя вуглы ў жыцці. Добра, што пісьменнік не абышоў у сваёй аповесці гэтыя вострыя вуглы, добра і тое, што ў аповесці яўна адчуваецца аўтарская сімпатыя і хваляванне, калі гутарка ідзе пра многіх з яе станоўчых герояў, такіх, як Шэрэр, Сакалоўскі, Карацееў, Саўчанка.

Аднак, нягледзячы на ўсё гэта, аповесць выклікае вельмі супярэчлівыя адчуванні, а ў канчатковым выніку — пачуццё незадаволенасці. І адбываецца гэта перш за ўсё таму, што хоць станоўчыя героі як быццам па замыслу аўтара людзі, якіх многа, аднак па кантэксту аповесці гэта людзі, якіх мала, людзі, чые добрыя якасці з'яўляюцца рэдкасцю. З многіх выказванняў герояў пачынае мімаволі ўзнікаць адчуванне, што ім у іх жыцці даводзілася бачыць многа дрэннага і мала добрага, што дрэннае бывала часцей за ўсё правілам, а добрае—выключэннем. Цяжка сабе ўявіць, што аўтар так і хацеў паказаць наша грамадства. Але так у яго атрымалася, і гэта факт, з якім у літаратуры даводзіцца лічыцца не менш, чым з самымі лепшымі намерамі аўтара.

Адной з форм адхілення ад метаду сацыялістычнага рэалізма ў мастацтве, гаворыць далей дакладчык, з'яўляецца аб'ектывізм, які даволі рэдка праяўляецца ў нашай літаратуры ў форме кніг, поўнасцю напісаных з варожых нам ідэйных пазіцый, аднак, тым не менш, знаходзіць сабе тое ці іншае выяўленне ў радзе твораў.

Крытыкуючы аповесць В. Пановай «Поры году», дакладчык гаворыць, што пісьменніца разглядае чалавека, як дадзенае, а мы хочам паглядзець на яго і ў перспектыве.

І гэтае пытанне шырэй за размову аб адным вобразе Дарафеі. Мы можам нагадаць тут і вобразы Ліды, Мірзоева або Уздзечкіна з «Кружыліхі».

Спрашчэнская крытыка, імкнучыся вытлумачыць рэальна ўзнікаўшае пачуццё незадаволенасці вобразамі гэтых людзей, спяшалася па звычцы аб'явіць, што такіх не бывае. Гэта, разумеецца, няправільна: такія супярэчлівыя людзі, што выклікаюць супярэчлівыя пачуцці, не толькі бываюць, але іх нямала, і дзіўным было-б рэкамендаваць пісьменніку ўхіляцца ад іх паказу.

Але наша справядлівая ў адносінах да совецкага мастака прэтэнзія заключаецца ў тым, што мы хочам адчуваць, куды ідуць намаляваныя ім людзі, у які — лепшы ці горшы — бок яны будуць змяняцца, з якраз гэта да канца вызначыць нашы адносіны да іх.

Дакладчык рашуча крытыкуе тэорыю бесканфліктнасці, якая ўсёй сваёй сутнасцю супярэчыць прынцыпам сацыялістычнага рэалізма.

Не здымаючы адказнасці з пісьменнікаў і крытыкаў за тэорыю і, галоўнае, за практыку бесканфліктнасці, усё-ж у інтарэсах ісціны трэба сказаць, што атмасфера, якая спрыяла прыхарошванню жыцця ў радзе літаратурных твораў, не была чыста літаратурнай атмасферай. Прыхарошванне жыцця ў літаратуры звязана з радам акалічнасцей, што мелі месца ў нашай рэчаіснасці, ускрытых на XIX з'ездзе партыі і на апошніх Пленумах ЦК КПСС. Прыхарошванне жыцця ў літаратуры звязана з меўшымі месца ў нашым грамадскім жыцці настроямі самазадаволенасці, параднай самазаспакоенасці, нежадання турбаваць сябе крытыкай памылак і недахопаў, адмоўных і хваравітых з'яў, рэальна існуючых у жыцці. Невыпадкова, што прыхарошванне жыцця найбольш востра праявілася ў літаратурных творах, звязаных па матэрыялу з жыццём нашай вёскі, таму што гэта і была тая галіна нашага жыцця, дзе існавала больш за ўсё недахопаў, памылак, запушчанасці, вельмі рэзкіх супярэчнасцей паміж сапраўдным становішчам і яго асвятленнем на працягу раду год.

Пры гэтым памылка пісьменнікаў, разумеецца, заключалася не ў тым, што яны паказвалі новае, перадавое, а ў тым, што самае перадавое, самае ўзорнае і лепшае, сапраўды існаваўшае ў жыцці нашай вёскі, нярэдка паказвалася ў іх кнігах не як прыклад для пераймання, не як арыентыр для агульнага руху наперад, але выдавалася за нешта ўжо скрозь дасягнутае.

Нам трэба выразна сказаць, што гісторыя нашага совецкага грамадства, адлюстраванню якой на працягу трох з паловай дзесяцігоддзяў аддадзены галоўныя сілы совецкай літаратуры, як і кожная гісторыя, ні на якіх яе этапах не мае патрэбы ні ў пагоршанні, ні ў палепшанні.

Між тым, імкненне ігнараваць складанасці, супярэчнасці і ценявыя бакі рэчаіснасці, выдаваць многае з толькі яшчэ жаданага за ўжо існае, нярэдка цягнула за сабой у літаратуры, у крытыцы, у рэдакцыйнай рабоце імкненне глядзець і на мінулае Совецкай краіны з пазіцый прыхарошвання жыцця, імкненне антыгістарычна падцягваць мінулае да сучаснасці.

Так з'явіліся заклікі змякчыць у творах аб грамадзянскай вайне элементы стыхійнасці, несвядомасці, якія былі ўласцівы пэўным катэгорыям людзей таго часу. Так падаваліся парады спрасціць паказ складанага шляху старой інтэлігенцыі, якая ў выніку прыйшла на службу народу; так у адносінах да твораў аб вайне высоўваліся патрабаванні ўжо ў 1941 годзе паказаць ваеннае ўмельства нашых камандзіраў такім дасканалым, якім яно стала толькі ў ходзе вайны, у 1943—1944 гадах.

Адкрыта перастраховачныя і прыкрытыя розная роду ілжывым тэарэтызаваннем спробы разбурэння пазнейшых уяўленняў у папярэдні час не раз адбіваліся на нашай літаратуры вельмі адмоўным чынам.

Па-першае, здаралася, што творы каштоўныя, якія праўдзіва паказвалі адпаведную эпоху гісторыі совецкага грамадства, у тым ліку і творы памёршых аўтараў, аказваліся забытымі, не перавыдаваліся, і нават упамінанні аб іх не ўключаліся ні ў артыкулы, ні ў агляды літаратуры.

Па-другое, нямала твораў жывых аўтараў, дзе былі рэальныя недахопы, не заўважаныя тады, калі кніга пісалася, але прыкметныя цяпер, з новай гістарычнай вышкі, пры перавыданні перапрацоўваліся не па лініі выпраўлення сапраўдных памылак або мастацкай недасканаласці, а па лініі падгонкі мінулага да сучаснага, і тым самым, натуральна, псаваліся.

Нарэшце, па-трэцяе, аднатомнікі і многатомныя зборы твораў нашых сучаснікаў часта выдаваліся ў неапраўдана звужаным выглядзе, не даючы ўяўлення аб сапраўдным шляху пісьменніка, аб многім істотным, што ім створана.

Дакладчык крытыкуе творчыя памылкі Ф. Панфёрава і С. Бабаеўскага, якія, няправільна разумеючы ролю асобы ў гісторыі, у сваіх творах налавалі героям рысы гіпербалічнасці, любаваліся імі, прыўзнімалі над масай. У прыватнасці, ён падрабязна аналізуе вобраз Сергея Тутарынава з раманаў С. Бабаеўскага. Адзначаючы веданнe пісьменнікам калгаснага жыцця, наяўнасць у яго творы жыццёва праўдзівых эпізодаў, звяртаючы ўвагу на цяжкасці, якія стаялі перад пісьменнікам, што адным з першых паспрабаваў расказаць аб перамогах і поспехах у справе аднаўлення і ўмацавання калгасаў у пасляваенны перыяд, дакладчык у той-жа час прасочвае, як ужо ў першай кнізе рамана з'явіліся трывожныя сімптомы згладжвання жыццёвых цяжкасцей і супярэчнасцей.

Любіць свайго героя — гэта яшчэ не азначае надзяляць яго лёгкімі поспехамі, не азначае ўзбагачаць і ўзвышаць яго звыш меры за кошт прыбяднення акружаючых яго людзей, якім толькі і застаецца, што рапартаваць яму або глядзець на яго знізу ўверх, задраўшы галовы. Любоў да героя не павінна перашкаджаць праўдзівасці яго паказу, інакш у кнігах пачынае прыжывацца асаблівая форма лакіроўкі рэчаіснасці, калі сярод дзесяткаў праўдзівых дэталей жыцця, сярод жывых людзей, намаляваных на другім плане, паступова вырастае герой, які ў сілу сваёй выключнасці з выключнай лёгкасцю здзяйсняе ўсё тое, што ў пакутах і радасцях цяжкіх перамог даецца іншым, звычайным людзям.

Прамоўца лічыць, што перадз'ездаўская дыскусія мела рысы схаластыкі таму, што ўсе яе палажэнні звычайна аргументаваліся адным-двума літаратурнымі героямі. Ён называе рад станоўчых вобразаў мастацкай літаратуры, якія разам складаюць як-бы калектыўны партрэт перадавых людзей нашага грамадства.

Далей К. Сіманаў спыняецца на тэме працы і ўсебаковым паказе чалавека ў літаратуры.

Чалавек не можа быць для нас прыгожым і прывабным, гаворыць ён, калі непрыгожыя, непрывабныя, нявартыя яго адносіны да працы. Таму што яго адносіны да працы — гэта пытанне яго сумленнасці перад народам. Яго адносіны да працы — гэта пытанне яго ідэйнасці, яго адданасці — не на слове, а на справе, — ідэям комунізма.

Прамоўца падрабязна аналізуе прычыны, якія абумоўліваюць збеднены паказ духоўнага свету совецкага чалавека ў мастацкіх творах. Гэта — забыццё асабістага жыцця героя літаратурнага твора, або, наадварот, цікавасць да яго асабістага жыцця на шкоду грамадскім яго праяўленням.

Дакладчык падкрэслівае неабходнасць стварэння ў нас той атмасферы глыбокай павагі да майстэрства, калі ні пры якіх абставінах слабая кніга не будзе лічыцца сярэдняй, сярэдняя — добрай, а добрая— выдатнай.

Садаклад заканчваецца словамі вялікага Горкага, сказанымі ім на апошнім пасяджэнні Першага ўсесаюзнага з'езду совецкіх пісьменнікаў:

«Мы ўключаны ў велізарную справу, справу сусветнага значэння, і павінны быць асабіста вартымі прыняць удзел у ёй... Нам нельга ні на мінуту забываць, што пра нас думае, слухаючы нас, увесь свет працоўнага народа, што мы працуем перад чытачом і гледачом, якога яшчэ не было за ўсю гісторыю чалавецтва. Я заклікаю вас, таварышы, вучыцца — вучыцца думаць, працаваць, вучыцца паважаць і цаніць адзін другога, як цэняць адзін другога байцы на палях бітвы, і не траціць сілы ў барацьбе адзін з другім за глупства, у той час, калі гісторыя заклікала вас на бязлітасную барацьбу са старым светам». **(Працяглыя апладысменты).**

Матэрыялы з'езду друкуюцца па скарочаных стэнаграмах.

Совецкая паэзія

★

Садаклад Самеда ВУРГУНА

★

У пачатку свайго садаклада Самед Вургун гаворыць аб велізарным уплыве Кастрычніцкай сацыялістычнай рэволюцыі на развіццё грамадскай думкі чалавецтва, на лёс буйнейшых пісьменнікаў народаў, што насялялі былую царскую Расію, і прагрэсіўных пісьменнікаў свету. Прамоўца падкрэслівае, што совецкая паэзія —прапагандыст ідэй комунізма, пясняр гэтых ідэй.

У якіх-жа мастацкіх вобразах увасабляла наша паэзія грамадзянскія і рэволюцыйныя імкненні? Якія станоўчыя тыпы і характары яна стварыла?

Па-першае, гэта вобразы гістарычных герояў — перадавых людзей далёкага мінулага, вобразы дзяржаўных дзеячоў, воінаў, народных герояў і волатаў, вучоных і паэтаў. У нас напісаны рад значных гістарычных паэм і драматычных твораў у вершах. У паэме «Данііл Галіцкі» Міколы Бажана праўдзіва дадзены вобраз гістарычнага героя і ярка паказаны народ, які абараняе родную зямлю ад іншаземных захопнікаў.

Грузінскі паэт Сімон Чыкавані напісаў таленавітую паэму «Песня пра Давіда Гурамішвілі»; беларускі паэт Пятрусь Броўка напісаў паэму пра нацыянальнага героя «Кастусь Каліноўскі», азербайджанскі паэт Сулейман Рустам напісаў драму ў вершах «Уцякач Набі», у якой паказаны народны герой, што змагаецца супраць царызма і самавольства мясцовых феадалаў. Ільі Сельвінскаму ў трагедыі «Ад Палтавы да Гангута» ўдалося, на мой погляд, у моцных драматычных калізіях паказаць вобраз Петра I, пераўтваральніка Расіі.

Па-другое, невычэрпнай крыніцай натхнення для стварэння вобразаў станоўчых герояў з'яўляецца гісторыя нашай рэволюцыі.

Совецкая паэзія дала новы тып твораў, у якіх галоўнае месца займае не падрабязная, паслядоўна выкладзеная біяграфія, біяграфія вялікага чалавека, а перш за ўсё вобразнае выказванне і раскрыццё грамадскага сэнсу яго дзейнасці. Узорам такога твора з'яўляецца паэма Маякоўскага «Уладзімір Ільіч Ленін», дзе выццё правадыра дадзена ў непарыўным адзінстве з гістарычнымі падзеямі эпохі, на фоне якіх з вялікай сілай паказаны гістарычны размах дзейнасці Ільіча, дадзены яго велічны, чалавечны вобраз.

Стварэнне станоўчага вобраза героя сучаснасці — цяжкая задача. Вырашаючы яе, некаторыя з нашых аўтараў упадаюць у схематычнасць і павярхоўнасць, ім не ўдаецца раскрыць вобразы сучаснікаў з усёй глыбінёй і ўсебаковасцю.

Паэтам яшчэ мала ўдаюцца вобразы простых людзей — нашых сучаснікаў, якія маглі-б служыць прыкладам і прадметам для пераймання.

Мне думаецца, што адной з прычын слабасці такіх вобразаў з'яўляецца адсутнасць накопленага вопыту ў паэтычнай распрацоўцы сучасных тэм і характараў, у той час як у галіне гістарычнай тэмы і гістарычных вобразаў сусветная паэзія мае векавыя традыцыі.

Другой прычынай з'яўляецца тое, што нельга стварыць вобраз станоўчага героя па-за яго барацьбой са злом, з адмоўнымі, супрацьстаячымі сіламі. Аднак некаторыя пісьменнікі і крытыкі лічаць за лепшае абыйсці жыццёвыя і вострыя сутыкненні з «сіламі зла» і абмежавацца дробнымі супярэчнасцямі ў самім характары станоўчага героя — маўляў, станоўчы пачатак у чалавеку заўсёды змагаецца з яго адмоўнымі рысамі.

Выключная магчымасць для стварэння абагуленых характараў і вобразаў, з'яў і падзей грамадскага жыцця адкрываецца для мастака ў эпічнай паэзіі.

Эпоха вялікіх рэволюцыйных змен павінна зрабіцца эпохай стварэння вялікіх паэтычных палотнаў, якія глыбока раскрываюць сэнс гістарычных падзей народнага жыцця.

Ужо ў перадрэволюцыйнай сваёй паэме «Вайна і мір» Маякоўскі звярнуўся да ўвасаблення тых падзей, якія ўскалыхнулі ўсё чалавецтва, імкнуўся іх ахапіць ва ўсім іх гістарычным значэнні. У паэмах «Уладзімір Ільіч Ленін» і «Добра!» ён стварыў шырокую карціну вялікіх гістарычных змен, якія адкрылі новую эру ў гісторыі чалавецтва. Вялікі і складаны змест Маякоўскі раскрывае і ў эпічных вобразах, і ў лірычнай прамове, якая адлюстроўвае суб'ектыўнае ўспрыняцце паказваемых ім падзей. Гэтыя два планы, дзве лініі — эпічная і лірычная — у паэме Маякоўскага арганічна зліты адна з другой.

Задача нашых совецкіх паэтаў — стварэнне вобраза совецкага чалавека — змагара за новы свет, чалавека-будаўніка. На гэтым шляху нашай эпічнай паэзіяй ужо створана нямала вартага ўвагі.

Н. Асееў у «Семёне Праскакаве» намаляваў вобраз героя грамадзянскай вайны, у якім гістарычная даставернасць, амаль дакументальнасць спалучалася з вялікай лірычнасцю. Эдуард Багрыцкі ў «Думе пра Апанаса» ў вострым сутыкненні чалавечага лёсу і характараў з рамантычнай палымянасцю сцвярджаў ідэю адданасці сацыялістычнай рэволюцыі. Нікалай Дземянцьеў напісаў апавяданне ў вершах «Маці», дзе акрэслена намаляваны і тонка псіхалагічна распрацаваны характары і адносіны герояў. У гады Вялікай Айчыннай вайны былі напісаны новыя эпічныя творы. Н. Тіханаў у паэме «Кіраў з намі» і В. Інбер у паэме «Пулкаўскі мерыдыян» уславілі патрыятычнае натхненне і гераічную стойкасць блакіраванага Ленінграда. Той-жа тэме прысвяціла «Лютаўскі дзённік» О. Бергольц. У паэме «Сын» П. Антакольскага з вялікай сілай дадзены вобраз нашага маладога пакалення, якое адважна змагалася за Радзіму, за нашу справядлівую справу. А. Куляшоў у паэме «Сцяг брыгады» стварыў рамантычныя вобразы і карціны народнай барацьбы з захопнікамі. Да ліку значных паэм, прысвечаных Айчыннай вайне, трэба аднесці «Праметэя» А. Малышкі, дзе паэт умела выкарыстаў старадаўнія паданні для раскрыцця характару сучаснага барацьбіта за шчасце чалавецтва.

Гэтыя паэмы з'явіліся несумненнымі дасягненнямі нашай паэзіі ў стварэнні эпічнага вобраза совецкага чалавека. А іменна гэтая задача, на мой погляд, і з'яўляецца асноўнай і важнай для нашай паэзіі. У паэмах ваенных гадоў эпічная і лірычная формы апавядання атрымалі шчыльнае арганічнае адзінства, шматгранны і рознабаковы паказ у адпаведнасці з індывідуальнымі асаблівасцямі паэта. Тут своечасова паставіць пытанне аб розніцы паміж эпасам і лірыкай. Калі паэт раскрывае сябе, свой характар, свае роздумы, як-бы раскрывае перад чытачом сваю душу, калі ён гаворыць аб тым, што непасрэдна хвалюе яго, чым ён жыве і дыхае, — гэта лірыка. Калі ён, укладваючы ўсю сілу свайго розуму, запалу, пераканання, малюе карціны народнага жыцця, — гэта эпас. Я не даю тут дакладных, вычарпальных азначэнняў, але гавару аб тым, што мне здаецца галоўным у лірыцы і ў эпасе.

Побач з паэмамі лірыка-эпічнымі павінны атрымаць шырокае развіццё і паэмы эпіка-драматычныя з цэласным сюжэтам, з вострымі канфліктамі, з поўна і акрэслена намаляванымі чалавечымі характарамі. Нашай паэзіі патрэбны раманы ў вершах, якія даюць шырокія карціны чалавечага жыцця, чалавечых адносін. Гэтая форма атрымала ўдалае, на нашу думку, увасабленне, напрыклад, у паэмах Я. Коласа «Новая зямля» і «Рыбакова хата», у «Пераваале» Я. Ухсая.

Эпічная паэзія дае мастаку магчымасць і для шырокага ахопу падзей, для стварэння самых рознастайных характараў, і для лірычнага і філасофскага роздуму.

Для совецкага паэта ўсе вострыя пытанні сучаснасці з'яўляюцца асабістымі, і падзел тэм і матываў на «асабістыя» і «грамадскія» часта аказваецца штучным.

У заключнай прамове на Першым усесаюзным з'ездзе пісьменнікаў Горкі сказаў: «Свет вельмі добра і ўдзячна пачуў-бы галасы паэтаў, калі-б яны разам з музыкантамі паспрабавалі стварыць песні, — новыя, якіх не мае свет, але якія ён павінен мець».

Паміж Першым і Другім з'ездамі многае зроблена для выканання гэтага запавету. Вядома, і раней стваралися песні, якія атрымалі ўсенароднае прызнанне.

І ўсё-такі народ справядліва прад'яўляе вялікі рахунак нашым паэтам-песенникам. Ён чакае ад совецкіх паэтаў новых, добрых песень.

Рытарычнасць, халодная разважлівасць, абстрактнасць адчуваюцца часам у нашай лірыцы. А паэт-жа павінен паэтызаваць свае думы і філасофскія развагі, павінен выказваць іх мовай мастацкіх вобразаў. Толькі тады думкі паэта набудуць сілу мастацкага ўздзеяння. Шматграннасць нашай рэчаіснасці падказвае і шматграннасць лірычных форм, патрабуе ад лірычнага паэта рознастайнасці вобразаў, жывасці і багацця фарбаў.

Лірыка не павінна быць падобнай на пералётную птушку, якая праспявала сваю звонкую песеньку і тут-жа паляцела... Лірычны верш, песня павінны западаць у душу чалавека і віць гняздо ў яго сэрцы і, як жар-птушка, саграваць яго, быць спадарожніцай чалавека ў працы, у барацьбе, у радасці, у смутку, абуджаць у чалавеку добрыя пачуцці, узвышаючы тым самым чалавека, робячы яго больш моцным, разумным і багатым духоўна.

Далей Самед Вургун спыняецца на пытанні рамантыкі ў паэзіі социялістычнага рэалізма.

— Рэволюцыйная рамантыка, — гаворыць ён, — уласціва прыродзе ўсёй нашай паэзіі. Але гэта не выключае таго, што можа і павінна існаваць у нашай паэзіі асаблівая форма рамантычнай паэзіі.

Таму, мне думаецца, надыйшоў час пачаць сур'ёзную размову аб рамантычным стылі ў нашай паэзіі.

Між тым, у нас ёсць таварышы, якія выяўляюць нейкую палахлівасць нават перад самім словам «рамантыка». Ім здаецца, што размова аб рамантыцы можа завесці нас у нейкі завоблачны свет, збіць з рэалістычнай пазіцыі ў літаратуры.

Уся гісторыя сусветнай паэзіі поўнасцю пацвярджае недарэчнасць такога сцвярджання. Лермантаў у сваіх рамантычных паэмах «Мцыры», «Каўказскі нявольнік», «Ізмаіл-Бей» стварыў яркія рэалістычныя характары, раскрыў вялікія чалавечыя страсці, праўдзіва паказаў гістарычныя падзеі і з'явы, побыт і нацыянальныя традыцыі розных народаў.

Калі творы нашых далёкіх папярэднікаў вытрымалі выпрабаванні стагоддзяў, дык гэта трэба вытлумачыць перш за ўсё і галоўным чынам тым, што ў іх услаўлена вялікая праўда жыцця, і ўслаўлена геніяльна. Вядома, нікому не прыдзе ў галаву ставіць знак роўнасці паміж рэалізмам гэтых класікаў і навейшым рэалізмам. Ясна, што рэалістычныя і рамантычныя традыцыі нашых далёкіх і блізкіх папярэднікаў трэба разглядаць як гістарычна складзеныя традыцыі, якія нельга механічна пераносіць у наш час.

Ці існуюць рамантычныя творы ў нашай паэзіі? Так, існуюць. Вершы і паэмы Уладзіміра Маякоўскага, у прыватнасці «Пра гэта» і «На ўвесь голас», лепшыя творы Эдуарда Багрыцкага, асабліва «Смерць піонеркі», раннія балады і «Кіраў з намі» Нікалая Тіханава, раздзел «Смерць і воін» у паэме А. Твардоўскага «Васілій Тёркін», моцныя сваім драматызмам і прыўзнятасцю паэма «Сын» Паўла Антакольскага, «Сцяг брыгады» і «Цымбалы» Аркадзя Куляшова, паэма «Александр Матросаў» Семёна Кірсанава, «Вясна ў «Перамозе» Нікалая Грыбачова, рад паэм Максіма Рыльскага, Андрэя Малышкі, «Перварасійск» Ольгі Берггольц і многія іншыя творы гавораць аб тым, што ў нас існуе выразна выяўленая рэволюцыйна-рамантычная форма ў паэзіі, злітая з рэалістычным паказам жыцця.

Ва ўсіх гэтых творах гучаць розныя галасы, раскрываюцца самабытныя індывідуальнасці паэтаў. Аднак ёсць і агульныя рысы, якія адрозніваюць рамантычныя творы ад твораў іншых стыляў.

Па-першае, паэт, паклаўшы ў аснову свайго твора рэальныя з'явы, рэальных чалавечых характары і вобразы, услаўляе іх ва ўзвышаных тонах у найбольш яркіх фарбах. Адсутнасць у радзе рамантычных твораў шырокага ахопу жыццёвага шляху герояў не перашкаджае паэтам ствараць чалавечыя характары, паказваць вялікія пачуцці.

Па-другое, паэт-рамантык свядома завастрае станоўчыя пачаткі жыцця, часцей звяртаецца да «незвычайнага», а часам і да выключных характараў, падзей, фактаў; ён імкнецца хутчэй убачыць, намаляваць будучае, правяраецца ў заўтра.

Некаторыя таварышы сцвярджаюць, што наша рэчаіснасць настолькі цудоўная і нашы людзі настолькі харошыя, што не маюць патрэбы ў паэтычнай ідэалізацыі. Гэта няправільна. Наша рэчаіснасць цудоўная і нашы людзі на самай справе харошыя — гэта бясспрэчна, але чалавек, які заслугоўвае гэтага звання, чалавек сацыялістычнага грамадства ў асаблівасці, вялікі тым, што яго ідэалы і імкненні наперад, яго светлыя мары і фантазіі заўсёды апярэджваюць яго рэальнае існаванне.

Вось чаму мы не павінны баяцца падкрэсліваць станоўчыя бакі ў характарах людзей, у іх імкненнях і ўздзейнічаць такім спосабам на нашу рэчаіснасць у яе рэволюцыйным развіцці, паказваць яе рух да вышынь чалавечай думкі, культуры.

Па-трэцяе, паэт-рамантык актыўна ўмешваецца ў думкі і душу, у духоўны свет свайго станоўчага або ідэальнага героя. Ён услаўляе ў ім свае ўласныя ідэалы, свае погляды на жыццё, на гісторыю, на будучае.

Мы павінны ўсяляк заахвочваць і падтрымліваць цудоўныя рамантычныя пачаткі ў нашай паэзіі ў імя вялікага рэалізма, авеянага высокімі ідэямі, светлымі крылатымі марамі.

Прамоўца выказвае некалькі думак аб праблеме станоўчага героя ў паэзіі, пераходзіць да разгляду некаторых пытанняў формы і майстэрства і ставіць пытанне.

— Ці заўсёды мы выконваем запавет Некрасава, — клапоцімся аб «стылі, што адпавядае тэме»? Вось, напрыклад, вершы Сергея Міхалкова з выпадку выпрабавання совецкай вадароднай бомбы, надрукаваныя нядаўна ў «Литературной газете»:

Оборона — наша честь,
Дело всенародное.
Бомбы атомные есть,
Есть и водородные!

Або другі слабы верш, прысвечаны пуску першай у свеце электрастанцыі, якая працуе на атамнай энергіі!

Балюча чытаць пад гэтымі вершамі подпіс С. Міхалкова, аднаго з нашых яркіх паэтычных талентаў.

На жаль, няўдалыя вершы сустракаюцца ў творчасці і іншых нашых буйных паэтаў. Так, напрыклад, можна ўказаць на верш К. Сіманава «Панам-маралістам».

Прымітыўныя, халодна разважлівыя і рытарычныя — песня М. Ісакоўскага «У дарогу», верш А. Суркова «У імя міру» і рад вершаў іншых паэтаў.

Актуальнасць тэмы яшчэ не дае права гаварыць аб актуальнасці і, значыць, дзейснасці мастацкага твора. Сіла сапраўднага майстэрства — гэта сіла мастацкага абагульнення.

Душу нашай паэзіі складае яе дэмакратызм, народнасць.

Народнасць совецкай паэзіі заключаецца перш за ўсё ў тым, што яна ставіць праблемы, якія закранаюць жыццёвыя інтарэсы мільёнаў людзей.

Народнасць нашай паэзіі і ў тым, што яна ўзбагачае і развівае мастацкія густы і эстэтычныя погляды шырокіх народных мас.

* * *

Таварышы, перад нашай паэзіяй, як перад усёй совецкай літаратурай, стаяць грандыёзныя творчыя праблемы. Мы закліканы гісторыяй быць выказнікамі перадавых дум і спадзяванняў прагрэсіўнага чалавецтва. Гераічная, поўная рамантыкі барацьба прагрэсіўнага чалавецтва за мір, дэмакратыю і социялізм павінна натхніць нашых паэтаў на стварэнне тыпаў і вобразаў герояў нашага часу.

У цэнтры ўсёй нашай паэтычнай думкі павінен стаяць велічны вобраз новага, социялістычнага чалавека, творцы новай гісторыі, ва ўсім багацці яго шматграннай працоўнай і творчай дзейнасці, з усімі яго высокімі ідэаламі і маральнымі якасцямі.

Мне здаецца, што сённяшні стан нашай паэзіі нагадвае стан арла перад узлётам: ён мерае вачыма шырокі прастор для гэтага ўзлёту і набірае сілы. Мы цвёрда верым, што гэты ўзлёт адбудзецца. Ёсць для гэтага ў нас магутны арол — гэта наша вялікая паэзія. Ёсць перад намі вялікі прастор — гэта прастор нашага жыцця, нашай социялістычнай рэчаіснасці; ёсць і вышыня для вялікага ўзлёту — гэта вышыня нашых комуністычных ідэалаў!

Няхай жыве комунізм!

Няхай жыве паэзія! **(Працяглыя апладысменты).**